Шмат чаго адбываецца ў нашым жыцці — і цікавага, і сумнага, і нават камічнага. Як кажуць, усяго хапае. Вось, напрыклад, невялічкая гісторыя, якая адбылася не так даўно з жыхаркай Крычава бабкай Наталляй (імя зменена).

Атрымала старая свой чарговы невялічкі пенсіён і вырашыла паесці смачненькага. Пайшла на гарадскі рынак, каб хоць раз у месяц набыць нечага незвычайнага для свайго рацыёну. Пахадзіла, пашукала і, нарэшце, набыла даволі танны кавалак чыстай, без касцей, парасяцінкі.

Па прыходзе дадому Наталля ўзялася рыхтаваць набыты кавалак да гатоўкі — памыла, парэзала... Першай адчула падвох кошка Мілка, якая чамусьці пачала паводзіць сябе неяк трывожна — шыпела на мясныя абрэзкі, хавалася пад стол, нервавалася.

Калі вада з мясам закіпела, у хаце востра запахла псінай. Суседзі, якіх паклікала бабуля, безапеляцыйна пацвердзілі, што набытае мяса безумоўна належыць сабаку — пераблытаць тут немагчыма.

І доўга яшчэ старая не магла зразумець, як можна было купіць сабачыну на рынку, дзе ёсць лабараторыя, спецыяльная служба кантролю і складаная працэдура доступу мясных прадуктаў да продажу?

Страшна

Пачалося шырокамаштабнае выкарыстанне сельскагаспадарчых угоддзяў, прадукцыя з якіх яшчэ не адну тысячу гадоў будзе несці толькі адно — смерць. На адселеныя ў свой час тэрыторыі пачалі вяртацца падманутыя і ўбаюканыя ўладамі і часам людзі. Гэты працэс усялякім чынам накіроўваецца і падтрымліваецца кіраўніцтвам усіх узроўняў.

Падобную тэндэнцыю можна прасачыць на прыкладзе Чэрыкаўскага раёна. Гэты раён знаходзіцца ў ліку самых пацярпелых ад чарнобыльскай навалы. Львіная частка Чэрыкаўшчыны стала абсалютна непрыдатнай для жыцця дзесяткаў вёсак і вёсачак. Адной з самых забруджаных радыенуклідамі з'яўляецца вёска Зоры. Пяць гадоў адбывалася масавае адсяленне зарчан на чыстыя тэрыторыі. Жылыя дамы і адміністратыўныя будынкі бурылі і раўнялі з зямлёй. Але ў 1996 годзе Зоры было вырашана "рэабілітаваць" у ліку іншых шматлікіх населеных пунктаў па ўсёй Беларусі. Праз пэўны час пачалася праца па адбудове вёскі і аднаўленні ў ёй жыцця. Панасылалі ў шматпакутнае паселішча будаўнікоў, і пайшла праца...

Зараз у Зорах, яшчэ некалькіх суседніх вёсачках налічваецца адных толькі дзяцей больш за 100. Людзі сеюць бульбу і буракі ў разбаўленую радыенуклідамі глебу, збіраюць грыбы і ягады ў нячыстых лясах, пасвяць жывёлу на лугах. Жывуць людзі...

Андрэй КУЗЬМІН,
кіраўнік інфармацыйнай службы "Кантакт-цэнтр".
г.Крычаў.

РАЗОБЛАЧЕНИЯ

Об очередных успехах белорусского правительства

Александр СТАРИКЕВИЧ

Во время своих вояжей по российским просторам большие и маленькие чиновники из Беларуси в лучших традициях барона Мюнхгаузена взахлеб рассказывают об успехах "уникального социально-экономического курса, проводимого мудрым руководством страны". Как правило, эти повествования принимаются за чистую монету: много ли, скажем, на Урале знают о ситуации в Минске, Витебске, Гродно... Но если кто-то вдруг задает неудобный вопрос, парируют примерно таким образом, как это сделал Александр Лукашенко в недавнем интервью каналу РТР: "Вы эту информацию взяли из оппозиционной прессы. Кому вы верите?".

Что ж, давайте обратимся к официальным источникам. В распоряжении "Новых Известий" оказался любопытный документ — ориентировка для выступающих перед населением групп официальных пропагандистов "О социально-экономическом развитии республики в 1996—2000 годах и в 2000 году". За подписью первого заместителя главы президентской администрации Владимира Заметалина она разослана по всей идеологической вертикали: в органы власти, на предприятия, в колхозы и совхозы и т.д. Даже в этом откровенно приглаженном документе среди данных о среднесуточном привесе свиней и прочей подобной информации содержится немало интересного.

Главной и наиболее серьезной негативной тенденцией называется спад инвестиций производственного назначения. Их общий объем к уровню 1990 года составил всего 35,3%. В то же время требуется срочно привлечь средства для обновления катастрофически состарившихся основных фондов (коэффициент износа практически во всех отраслях народного хозяйства составляет 65—75%). Однако решить эту задачу будет весьма непросто: с Западом белорусское руководство рассорилось всерьез и надолго, регулярные конфликты с частными инвесторами, вроде безосновательного расторжения долгосрочного договора аренды с "Макдоналдсом", также, мягко говоря, не способствуют приходу в страну капитала.

В документе отмечается, что темпы роста денежной массы по сравнению с намеченными превышены. Ускоренная девальвация белорусского рубля не позволила удержать инфляцию в запланированных рамках 4,5—5,5% в месяц (индекс потребительских цен по итогам 2000 года к декабрю 1999-го составил 207,5%). Тут авторы записки лукавят: Александр Лукашенко публично ставил правительству задачу, чтобы среднемесячный показатель инфляции не превышал 2%. Умалчивается и о том, что она остается самой высокой в СНГ.

Далее приведем лишь несколько цитат из ориентировки (сохранено правописание оригинала):

"Не все благополучно с реализацией промышленной продукции. Одновременно с ростом производства произошло увеличение ее складских запасов до 59,8% к среднемесячному объему производства. Наибольший уровень запасов сложился в экспортоориентированных отраслях — легкой промышленности (101%) и машиностроении и металлообработке (94,5%)".

"Произошло увеличение числа убыточных предприятий во ВСЕХ (*выделено мной.* — **А.С.**) отраслях экономики, кроме связи. Их удельный вес в целом по народному хозяйству составил 23,4% против 16,9% в 1999 г.".

"В то же время республике не удалось в полной мере активизировать экспорт отечественных товаров на российский рынок. Произошло снижение поставок в натуральном выражении по 28 товарным позициям. Это касается таких основных белорусских товаров, как тракторы, части и принадлежности автомобилей и тракторов, холодильники и морозильники, шины, обувь, нити комплексные синтетические, продукты переработки нефти и другие. В то же время цены по данным товарам были увеличены в среднем на 45,4%".

"Сохраняется проблема бедности — почти у половины населения доходы пока ниже бюджета прожиточного минимума".

Тем не менее на основании вышеизложенного авторы ориентировки делают вывод, что "в 2000 году удалось обеспечить положительную динамику по основным макроэкономическим показателям и выполнить важнейшие параметры прогноза социально-экономического развития республики". Кроме того, констатируется, что завершен переломный этап "в преодолении трансформационного спада".

Подчеркнем, что это официальный документ, подготовленный главным управлением общественно-политической информации администрации Лукашенко, которое уж никак не заинтересовано хаять окружающую действительность. Впрочем, в этой связи вспоминается старый анекдот.

Идет собрание колхоза. Выступает председатель:

— Товарищи, не буду скрывать, что положение нашего хозяйства очень-очень хреновое.

Голос из зала:

— Товарищ председатель, а вы часом не приукрашиваете?

("Новые Известия".)

Крывавая гара

У Віцебску знойдзена невядомае раней пахаванне каля 2000 грамадзян, расстраляных у ліпені 1941 года войскамі НКВД

У чэрвені 1991 года пры правядзенні археалагічных даследаванняў падмуркаў Успенскага сабора ў Віцебску ў адным з шурфоў археолаг Ігар Цішкін знайшоў вялікую колькасць чалавечых касцей. У шурфе косці размяшчаліся ў некалькі слаёў, літаральна штабялямі. Па факце выяўлення масавага пахавання даследчык падаў заяву ў пракуратуру Кастрычніцкага раёна Віцебска з просьбай высветліць абставіны смерці людзей, шкілеты якіх знаходзіліся ў шурфе. Была прызначана фізіка-тэхнічная экспертыза. Эксперты зрабілі заключэнне, што гэта пераважна косці жывёл і ніякіх іншых пашкоджанняў, акрамя як ад рыдлёўкі, на іх няма.

У 1998 годзе пры больш шырокім даследаванні падмуркаў гэтага ж сабора зноў выяўлена вялікая колькасць касцей. Чалавечыя парэшткі ляжалі зусім неглыбока, акурат каля самага падмурка. У наступным годзе працы па іх выяўленні працягвала рота 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна МА Беларусі. Былі выяўлены парэшткі больш як трохсот чалавек. Паводле разлікаў, у зямлі знаходзяцца рэшткі яшчэ паўтары тысячы чалавек.

Зусім нядаўна знойдзены дадатковыя звесткі ад віцебляніна, які перажыў нямецкую акупацыю, а перад ёю таксама знаходзіўся ў Віцебску. У сваіх нарысах Юрка Віцьбіч ("Спадчына" №4/2000) згадвае пра былы палац губернатара, які ў 30-я гады аблюбаваў усемагутны НКВД. Вялізныя сутарэнні палаца былі прыстасаваны пад турму, дзе "за адразу закратаванымі вокнамі апынуліся сотні вязняў". Паводле Ю.Віцьбіча, усіх гэтых вязняў энкавэдысты перастралялі пры панічных уцёках з Віцебска ў 1941 годзе.

Успенская гара сталася апошнім прытулкам ахвяр камуністычнага генацыду. У ліпені 1941 года перад самым прыходам немцаў у чэкістаў не было часу адвозіць знішчаць людзей на спецыяльна абсталяваны палігон у вёску Паляі пад Віцебскам. У пахаваннях няма прыкмет абутку і адзення — значыць, распраналі людзей і расстрэльвалі ў сутарэннях палаца губернатара.

Дзеля зручнасці і хуткасці скарыстаны сутарэнні і руіны разбуранай у 1937 годзе саборнай царквы святога мучаніка Ясафата і Успення Прасвятой Багародзіцы.

Віцебскае аддзяленне праваабарончага цэнтра "ВЯСНА".

"Ітэра" інкогніта... Пакуль...

У сераду Аляксандр Лукашэнка правёў у сваёй рабочай рэзідэнцыі закрытыя перамовы з кіраўніком карпарацыі "Ітэра" Ігарам Макаравым.

Гэты міжнародны холдынг, які аб'ядноўвае 120 прадпрыемстваў з 24 краін свету, пастаўляе ў Беларусь чвэрць неабходнага краіне аб'ёму газу — 4 мільёны кубаметраў штогод. ("Ітэра" згодная падпісаць пагадненне пра пастаўкі прыроднага газу ў Беларусь да 2010 года.) Пры гэтым кампанія, напрыклад, можа дазволіць сабе паўгода дабрачынна крэдытаваць Беларусь пастаўкамі газу на 100 мільёнаў долараў.

Гэткую дабрачыннасць афіцыйны Мінск аплачвае даволі шчодра — за апошнія гады "Ітэра" ператварылася ў кампанію, якая валодае выключным правам на ажыццяўленне бартэрных аперацый з Туркменіяй, Казахстанам ды Узбекістанам, што бяруць беларускую прадукцыю ў абмен на газ. Толькі за мінулы год у Туркменію было пастаўлена беларускіх тавараў на 100 мільёнаў долараў.

Каб уявіць маштабы дзейнасці кампаніі ў Беларусі, варта прыгадаць, што кіраўнік беларускага аддзялення "Ітэры" сп. Аляксандраў ужо здабыў мандат дэпутата Палаты прадстаўнікоў, а Ігара Макарава ўзнагародзілі ордэнам Францішка Скарыны. "Ітэра" вядзе пакуль беспаспяховыя перамовы пра акцыянаванне полацкага "Нафтану". Акрамя таго, "Ітэра" гатовая прафінансаваць рэканструкцыю магілёўскага аб'яднання "Хімвалакно" ды іншых знакавых для Беларусі праектаў: да прыкладу, стварэнне другога нацыянальнага тэлеканала БТ-2.

Ацэньваючы дзейнасць гэтай кампаніі ў Беларусі, журналісты ўсё часцей пачалі гаварыць пра "ціхую экспансію "Ітэры". Прычына такога шчыльнага сяброўства кіраўніцтва Беларусі з памянёным холдынгам — не толькі той факт, што Аляксандр Лукашэнка ды Ігар Макараў паходзяць з Магілёўскай вобласці. Былы "кашалёк" Лукашэнкі Іван Ціцянкоў зараз працуе ў "Ітэры" і ачольвае расійскую кампанію "Тэхнаэнергаальфа", якая займаецца пастаўкамі тавараў у Ірак. Назіральнікі прагназуюць, што менавіта "Ітэры" Лукашэнка адводзіць ролю аднаго з асноўных фундатараў сваёй перадвыбарчай кампаніі. "Лукашэнка знайшоў хлопцаў з грашыма", — заявіў Радыё "Рацыя" былы намеснік кіраўніка прэзідэнцкай Адміністрацыі Іван Пашкевіч.

І.П.: — Лукашэнка, як і іншыя палітыкі, будзе шукаць структуры з грашыма. Я ў гэтым не сумняваюся. Лукашэнка гаворыць, што гэтая кампанія ім праверaная. Гэтая "Ітэра" ўклала 1 мільён у розныя дабрачынныя праграмы. Значыць, у хлопцаў грошы ёсць. І натуральна, што Лукашэнка будзе шукаць такіх хлопцаў у пэрыяд прэзідэнцкай кампаніі і выкарыстоўваць іхнія грошы. Пэўным гарантам тут выступае Іван Ціцянкоў, які — нагадаем — працуе ў "Ітэры".

Юрась КАРМАНАЎ
радыё "Рацыя".

Народная Воля · 4 МАЯ 2001 г.

Эгонс НЕЙМАНИС,
Временный Поверенный Латвийской Республики:

“Тюрьмы и железные дороги пока остались в ведении государства”



Визитная карточка. *Эгонс Нейманис родился в ноябре 1962 года в Риге. Там же закончил среднюю школу. В 1981 году поступил в МГУ на факультет психологии. Работал в Латвийском Государственном университете на кафедре прикладной социологии и социальной психологии. Параллельно научной работе занимался и преподавательской.*

Карьеру дипломата начал с работы в МИДе Латвии в политическом отделе. С июня 1994 по февраль 1995 года возглавил Консульский департамент МИДа. Затем 3 года работал в качестве консула в Посольстве Литвы в Швеции. С мая 1998 года по февраль 2000 года — директор департамента информации МИД Латвии. С февраля 2000 года Временный Поверенный Латвийской Республики в Беларуси.

— Господин посол, простите за прямой вопрос, но он у всех на устах. Говорят, что в Латвии нарушаются права русскоязычных жителей.

— Не знаю, можно ли назвать нарушением прав человека то, что у нас латышский язык является государственным?! Ведь образование до сих пор можно получать на русском языке, издаются русскоязычные газеты, на радио и телевидении есть программы на русском языке.

В том, что тот, кто не является гражданином Латвии, должен сдать экзамен по латышскому языку, ущемлений прав человека мы не видим. Я считаю, что даже если человек и не имеет латвийского гражданства, ему полезно знать латышский, потому что все заседания парламента проходят на латышском языке, законы принимают тоже на латышском. У нас есть одна-единственная государственная газета “Вестник Латвии”, которая публикует все законы, постановления правительства, стенограммы парламента. И если человек желает быть в курсе происходящих событий, он имеет возможность сделать это только с помощью этой латвийскоязычной газеты.

— В некоторых европейских государствах существует большая проблема с несовершенной судебной системой: суды настолько долго рассматривают иски граждан, что люди теряют надежду и начинают обращаться в международные судебные инстанции. А как обстоят дела с этим в Латвии?

— У нас такая проблема тоже существует. Наше Министерство юстиции пытается что-то делать для решения этого вопроса, но происходит это не оперативно. Кстати, могла бы быть лучше ситуация и в местах лишения свободы. Тюрьмы очень перенаселены. Поэтому мы пытаемся инвестировать деньги в эту область. Скандинавские страны помогают нам проводить работу по улучшению ситуации в тюрьмах.

— Кстати, тюрьмы еще не приватизировали?

— Нет *(смеется)*, тюрьмы и железные дороги пока остались в ведении государства.

— Вы сказали, что в Латвии все газеты и журналы, кроме одного издания, независимые. Известно ли Вам, как складываются отношения между властью и СМИ?

— Независимые СМИ все равно зависимы от тех, кто дает им деньги. Но у нас не ощущается такой полярности власти и оппозиции, как в Беларуси. Это происходит только от выборов до выборов.

Разумеется, бывают публикации в газетах, которые кому-то из политиков не нравятся. Они стараются их опровергать. Если не удается договориться, подают на издание и журналиста в суд. Согласитесь, очень трудно каким-то образом воздействовать на то печатное издание или телеканал, которые не принадлежат государству.

— Какие реформы и преобразования происходят в вашей стране в связи с предстоящим вступлением в Европейский Союз?

— Начались переговоры о вступлении в Европейский Союз. Происходит подведение нашего законодательства к общеевропейскому знаменателю. Мы считаем, что будем готовы полностью для вступления в Европейский Союз к концу 2002 года.

— Как складывается экономическая ситуация в Латвии?

— Если вспоминать 1992—1993 годы, то все было очень плохо. У многих людей складывалось впечатление, что жизнь с каждым днем становится все хуже и хуже. Но в 1994—1995 годах падение остановилось и начался выход из кризисного состояния. Если обратиться к конкретным цифрам, то в 1995 году инфляция составляла 25% в год, в 96-м — 17,6%, в 99-м сократилась до 2,4% и сохраняется до сих пор на этом уровне.

С 1995 по 1999 год среднемесячная заработная плата возросла с 90 до 140 лат. В этот промежуток времени увеличился и средний размер пенсий — с 30 до 58 лат. И это при том, что количество пенсионеров увеличилось почти на 30 тысяч человек.

Прослеживается и заметный экономический рост. Все это вселяет в жителей нашей страны уверенность в завтрашнем дне. Об этом свидетельствует снижение смертности и рост рождаемости. За последние два года количество новорожденных выросло приблизительно на 5 %.

К сожалению, остается достаточно высоким уровень безработицы. Самый низкий — в Риге: 3,6%. Но в некоторых латвийских городах он доходит до 20—23%. Единственное утешение — в Риге проживает 1/3 часть всего населения Латвии.

— На каком уровне находятся торгово-экономические связи между нашими странами?

— Должен сказать, что белорусская сторона достаточно активно сотрудничает с Латвией. Вы довольно успешно продаете нам свои МАЗы, тракторы “Беларус”, пользуется спросом обувь фирмы “Белвест”, калийные удобрения. Словом, у Беларуси положительное торговое сальдо с Латвией.

В свою очередь мы поставляем вам соки “Гутта”, рыбные консервы. Ваша “Милавица” работает на сырье, которое приходит с латвийского завода “Лаума”.

— Как складываются у Латвии отношения со странами на постсоветском пространстве?

— Если коротко — хорошо. Об этом свидетельствует наличие посольства не только в Республике Беларусь, но и в Украине, Узбекистане, России и ряде других стран. Если говорить об экономических связях, то, естественно, уровень сотрудничества со странами СНГ несколько ниже, чем со странами Европейского Содружества. Например, по состоянию на январь 2001 года экспорт Латвии в страны ЕС составил 65,2%, в СНГ — 9,4. Нам было импортировано из СНГ — 16,1%, а из стран ЕС — 50,6%. Прежде всего это связано с выбранным Латвией политическим приоритетом.

— Не так давно белорусский премьер-министр Владимир Ермошин был в Риге. Это правда, что президент Латвии отказалась его принять?

— Так как у Ермошина не было официального приглашения с нашей стороны, его визит носил частный характер. Поэтому ваш премьер-министр был только лишь приглашен нашим премьер-министром на неофициальный завтрак. Но эта была неофициальная встреча двух премьеров.

— В Беларуси Вы уже больше года. Не могли бы Вы поделиться своими впечатлениями о нашей стране?

— Впечатлений много. Но я бы хотел поделиться не впечатлениями, а ощущением, которое возникло здесь со временем. Я заметил, что белорусы тоже спокойные, уравновешенные и в некотором смысле даже медлительные. В общем, в вас присутствуют все те же характеристики, которые не без основания приписывают нам. Здесь я нахожу много того, что мне внутренне понятно и приемлемо. Скорее всего, ощущаемая мною близость объясняется нашей эмоциональной схожестью.

— Говорят, легенда — это душа народа. Не могли бы Вы рассказать какую-нибудь красивую народную легенду...

— Когда-то в Латвии жил силач по имени Лачплесис. Он был рожден медведицей, поэтому у него были медвежьи уши, в которых была вся его сила. Лачплесис славился своими подвигами в борьбе с крестоносцами. В бою он всегда одерживал победу. Но среди крестоносцев был воин, которого звали Черный Рыцарь, которому в одном из сражений удалось отрезать уши Лачплесиса и лишить его таким образом силы. Легенда заканчивается тем, что в схватке они оба падают в Даугаву и погибают. Согласно этому преданию, когда Лачплесис воскреснет и выйдет из Даугавы, Латвия станет свободной.

Татьяна КУЧИНСКАЯ.

ДАЙДЖЕСТ

Путин включен в число главных противников свободы прессы

Президенты России и Украины Владимир Путин и Леонид Кучма включены в список 10 главных противников свободы прессы, подготовленный базирующимся в Нью-Йорке Комитетом защиты журналистов. Эта международная организация публикует подобный список ежегодно ко Всемирному дню свободы прессы, отмечаемый 3 мая. По словам исполнительного директора организации Энн Купер, Владимир Путин попал в список за действия, направленные на установление централизованного контроля за СМИ, зажим критики и уничтожение независимой прессы.

В список также включены иранский аятолла Али Хаменеи, председатель КНР Цзян Цзэминь, Фидель Кастро, президенты Либерии, Зимбабве и Туниса.

Напомним, что ранее уже такого “высокого” звания удостаивался президент Беларуси Александр Лукашенко.

Радио “Свобода”.

В пожаре на “Американских горках” в Кёльне пострадали 54 человека

В парке аттракционов “Страна фантазий”, расположенном под Кёльном, случился пожар, 54 человека получили ранения. Пожар произошел на “Американских горках” из-за короткого замыкания. В момент аварии на горках было около 150 человек. Им пришлось выбираться из вагончиков, находившихся на высоте 18 метров над землей.

Вспышки пламени зафиксировала камера слежения, а потом огонь начал быстро распространяться и перекинулся на деревянные здания, расположенные поблизости. Парк был закрыт, посетители эвакуированы, ближайшее шоссе было перекрыто для движения. По словам шефа кельнской полиции, люди получили в основном незначительные повреждения, серьезно никто не пострадал и не был госпитализирован. “Чудом удалось избежать ужасной катастрофы”, — добавил он. Пожар случился в праздничный день, когда в парке было много посетителей, примерно 20 тысяч человек.


Супермодель Ники Тейлор попала в аварию и находится в критическом состоянии

Американская супермодель Ники Тейлор, попавшая в автокатастрофу, находится в критическом состоянии из-за полученных повреждений внутренних органов. Автомобиль, в котором супермодель ехала в сопровождении двух мужчин, попал в аварию ранним утром в воскресенье в Атланте. Водитель не справился с управлением на крутом повороте, и машина врезалась в столб. Оба мужчины, о которых известно лишь, что они старые друзья Ники Тейлор, получили ранения и были вынуждены обратиться за медицинской помощью. Сама супермодель была пристегнута ремнем безопасности, поэтому сначала ей показалось, что она не пострадала. Однако позднее у Ники Тейлор начались сильные боли в области живота, и ее пришлось срочно госпитализировать.

У 26-летней супермодели два шестилетних сына-близнеца, Джейк и Хантер. Третья сестра семейства Тейлоров, Крисси, также начинающая модель, умерла от астмы в 1995 году в возрасте 17 лет, практически на руках у Ники, которая обнаружила Крисси в бессознательном состоянии в родительском доме.

“Си-Эн-Эн”.

Ниязов оштрафовал своего пресс-секретаря за курение



Президент Туркменистана Сапармурат Ниязов оштрафовал своего пресс-секретаря на один месячный оклад за курение в общественном месте. Штраф будет направлен в госбюджет. Два года назад туркменбаши подписал указ, в соответствии с которым любой гражданин страны за курение в общественном месте должен выплатить штраф в размере одной месячной зарплаты. Помимо этого в Туркменистане полностью запрещена реклама табака. Это произошло после того, как сам Ниязов по настоянию немецких хирургов бросил курить.

На снимке: Ниязов — строгий президент.

“Эхо Москвы”.

Министр юстиции Грузии устроил судьям экскурсию в тюрьму

Министр юстиции Грузии Михаил Саакашвили устроил 65 судьям экскурсию в тюрьму. Туда они были доставлены в обычных машинах, в которых осужденные обычно доставляются в места заключения. По мнению министра, подробное ознакомление судей с тюрьмами, куда они порой отправляют преступников, заставит их более вдумчиво подходить к вынесению приговоров и заменять тюремное заключение более мягкими мерами наказания — штрафами или отработками.

Министр надеется, что впредь не повторится дело 16-летнего мальчика, укравшего шесть килограммов ветчины и приговоренного к двум годам тюрьмы. Подобные приговоры, по словам Саакашвили, “превращают людей в кадры для преступной системы”. “И таких приговоров довольно много” — добавил он.

НТВ.

В Великобритании и Австралии Первомай отметили уличными боями

В столице Великобритании Лондоне на Первомай состоялись массовые демонстрации. Вышедшие на улицу антикапиталисты, противники глобализации, защитники окружающей среды и прав животных вскоре после начала манифестаций начали проявлять агрессивность, что вскоре привело к столкновениям с полицией. Однако правоохранительные органы, учитывая опыт предыдущих лет, когда первомайские демонстрации приводили к нанесению значительного ущерба, приняли повышенные меры предосторожности, и на улицы были выведены усиленные наряды. В центральной части города для контроля над 5 тысячами демонстрантов было задействовано 6 тысяч полицейских. Произошедшие столкновения не нанесли значительного вреда людям и зданиям, однако были зафиксированы случаи мародерства. Было арестовано около 50 человек, из них восемь оказались иностранцами — гражданами Польши, Дании, Бельгии и США. Пострадали 12 человек.

Марши протеста, сопровождавшиеся столкновениями с полицией, прошли также в ряде городов Австралии. Протестующие проводили различные акции: бросались на дорогу, чтобы помешать проезду полицейских автомобилей, сжигали портреты премьер-министра, а также изрисовали краской ресторан McDonalds. Около 30 человек были арестованы.

“Би-Би-Си”.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Энцыклапедыя “Народнай волі”, выпуск № 11

ЭДУАРД ПЯКАРСКІ

Стварыў слоўнік якуцкай мовы



Наўрад ці можна знайсці ў Рэспубліцы Саха (Якуція) чалавека, які б не ведаў імя Эдуарда Пякарскага. Яно і не дзіўна: са школьных гадоў мясцовыя школьнікі чуюць з вуснаў настаўнікаў, што Эдуард Карлавіч стаў першым, хто стварыў слоўнік якуцкай мовы, займаўся яе даследаваннем. Э.Пякарскаму рэгулярна прысвячаюцца розныя публікацыі, а да 100-годдзя з дня яго нараджэння, якое шырока адзначалася ў 1958 годзе, пабачыла свет кніга “Эдуард Карлавіч Пякарскі”, што складаецца з артыкулаў і ўспамінаў. А яшчэ якуты добра ведаюць, што Э.Пякарскі — родам з Беларусі, пра што, дарэчы, мы пачулі не так даўно. І адбылося гэта дзякуючы нястомнаму даследчыку Валянціну Грыцкевічу з Санкт-Пецярбурга.

Нарадзіўся Эдуард Карлавіч 25 кастрычніка 1858 года ў колішнім фальварку Пятровічы. Тады гэта быў Ігуменскі павет, цяпер Смалявіцкі раён. Хлопчык стаў першынцам у сям'і Карла і Тарэзы Пякарскіх. Хоць бацька Эдуарда і належаў да старадаўняга шляхецкага роду, сям'я не жыла ў дастатку. Арандатарская праца не прыносіла ні славы, ні багацця. Ды і з жонкай Карлу Пякарскаму не пашанцавала. Калі Эдуард пачаў толькі падрастаць, яна нечакана памерла. Давялося аддаць сына на выхаванне ў сялянскую сям'ю. А праз некаторы час зліталавалася родная цётка, якая жыла ў Мінску, і забрала пляменніка да сябе. Дзякуючы ёй, Эдуард авалодаў граматай, навучыўся пісаць і па-польску, і па-руску.

Пасля бацька накіраваў сына на вучобу ў Мазырскую гімназію. Тады Эдуард пазнаёміўся са стрыечным дзедам і яго сястрой, якія жылі ў палескім мястэчку Барбароў. Але ў сваякоў адчуваў сябе не вельмі ўтульна. Не ў апошнюю чаргу з-за іх скупасці. Хутка Э.Пякарскі пачаў займацца рэпетытарствам. А ў 1873 годзе развітаўся з Мазыром і перабраўся ў Мінск. Справа ў тым, што гімназію рэарганізавалі ў прагімназію, і ў ёй нельга было атрымаць сярэднюю адукацыю. Але ў Мінскай гімназіі правучыўся ўсяго паўгода. Бацька даведаўся, што дырэктарам Таганрогскай гімназіі стаў колішні дырэктар Мазырскай, і накіраваў туды сына. Вучоба ў Таганрогу стала для Э.Пякарскага пачаткам рэвалюцыйнай дзейнасці. Гурток, у які ён уваходзіў, неўзабаве быў разагнаны ўладамі. Пачалі пагаворваць, што ўсіх выдаў правакатар. Падазрэнне пала на Э.Пякарскага, таму ён, пакрыўджаны недаверам, пераверся ў Чарнігаўскую гімназію. Ад працягу рэвалюцыйнай дзейнасці не адмовіўся. Уладкаваўся ў шавецкую майстэрню, каб лепей было весці прапагандысцкую работу сярод рамеснікаў, рабочых.

Нягледзячы на тое, што гэта займала шмат часу, у гімназіі вучыўся добра, аднак, не знайшоўшы паразумення з асобнымі выкладчыкамі, падаў заяву аб адлічэнні. Гэтым разам занепакоенасць праявіў дзед Эдуарда Рамуальд Пякарскі. Як высветлілася, яму неабыякавы лёс унука. Паразумеліся на тым, што Эдуард даў слова працягваць вучобу і ў 1877 годзе паступіў у Харкаўскі ветэрынарны інстытут.

Тады ж, па прызнанні Эдуарда Карлавіча, ён “адразу ж далучыўся не столькі да вучобы, колькі да знаёмства з... новымі сябрамі, і хутка акунуўся ў студэнцкае асяроддзе. У большасці студэнтаў былі прагрэсіўныя і нават рэвалюцыйныя погляды... Дзейнасць студэнцкіх гурткоў цалкам захапляла чалавека, у якога былі хоць нейкія грамадскія інстынкты”.

Асаблівую актыўнасць Э.Пякарскі праяўляў, уваходзячы ў гурток, які ўзначальваў студэнт медыцынскага факультэта Дзмітрый Буцынскі. На фарміраванне яго свядомасці вялікі ўплыў аказалі тагачасныя палітычныя падзеі, і ў першую чаргу так званыя працэсы “50-ці” і “193-х”, калі царызм жорстка расправіўся з народнікамі. Адбыліся хваляванні і ў ветэрынарным інстытуце. Многія былі арыштаваны, але Э.Пякарскаму ўдалося схавацца. Праўда, ён быў выключаны з інстытута без права паступлення ў якую-небудзь іншую вышэйшую навучальную ўстанову. Акрамя таго, Э.Пякарскага завочна прысудзілі да шасці гадоў адміністрацыйнай ссылкі ў Архангельскую губерню.

Бунтаўшчык праз некалькі месяцаў “усплыў” у якасці пісара Княжа-Багародзіцкага валаснога ўпраўлення Тамбоўскага павета Івана Кірылавіча Пякарскага. Імя і імя па бацьку памяняў, каб не вельмі вылучацца сярод мясцовага насельніцтва. У хуткім часе зблізіўся з аграномам Міхаілам Дзевелем, памешчыкам Міхаілам Саціным, пісьмаводам у якога пачаў працаваць з чэрвеня 1879 года, увайшоў у рэвалюцыйнае таварыства “Зямля і воля”. Калі ж паліцыя напала на след рэвалюцыянераў, зноў пайшоў у падполле, атрымаўшы з дапамогай сяброў пашпарт на імя памешчыка Мікалая Палуніна. Хаваўся некаторы час у Смаленскай губерні. Паколькі ім зацікавіўся станавы прыстаў, перабраўся ў Маскву. Пасяліўся ў так званых Пятроўскіх Выселках, якія былі далёка ад цэнтра горада. Эдуарда Карлавіча тут высачылі і арыштавалі.

Справа Э.Пякарскага разглядалася 10—11 студзеня 1881 года ў Маскоўскім ваенна-акруговым судзе. Асудзілі да пазбаўлення ўсіх маёмасных правоў і высылкі на катаргу на 15 гадоў. Праўда, адначасова “суд пастанавіў хадайнічаць перад Маскоўскім генерал-губернатарам змякчыць Пякарскаму пакаранне на высылку на катаржныя работы на заводах на чатыры гады”. Губернатар, прыняўшы пад увагу маладосць Э.Пякарскага і хваравіты стан, прыняў рашэнне яго проста выслаць “у аддаленыя мясціны Сібіры”.

27 верасня 1881 года з кайданамі на нагах, хворы на запаленне лёгкіх, якое атрымаў у дарозе, Э.Пякарскі апынуўся ў Іркуцку. Яго далейшы лёс залежаў ад генерал-губернатара Усходняй Сібіры. Той распарадзіўся адправіць Эдуарда Карлавіча ў Якуцкую губерню. А 2 лістапада Э.Пякарскага прыняў сам якуцкі губернатар і месцам пасялення выбраў Першы Ігідзейскі наслег Бутурускага ўлуса (па цяперашнім адміністрацыйным падзеле Аляксееўскі раён Рэспублікі Саха), а гэта нейкіх 230 вёрст на паўночны ўсход ад Якуцка. Па прыездзе ў Ігідзейцы Эдуарда Карлавіча прызначылі так званым гаспадаром міждваровай станцыі. На станцыі праходзілі розныя сходкі і можна было знаходзіцца сярод людзей, але ў астатні час гняла адзінота.

Каб жыць (жыць, а не проста існаваць!), трэба было абавязкова знайсці паразуменне з мясцовым насельніцтвам. Дасягнуць жа гэтага куды прасцей, калі авалодаць мясцовай гаворкай. Нездарма ж кажуць: мова — душа народа. Першым настаўнікам Э.Пякарскага ў авалодванні якуцкай мовай (яна адносіцца да цюркскай групы і вельмі цяжкая для ўспрымання еўрапейскага чалавека, паколькі ёсць гукі, якія можна правільна ўзнаўляць толькі пасля доўгай трэніроўкі) стаў сляпы бацька ўтрымальніка той міждваровай станцыі, дзе Эдуард Карлавіч працаваў некалькі месяцаў па прыездзе ў Ігідзейцы. Стары паказваў яму асобныя прадметы і тлумачыў, як іх назва гучыць па-якуцку. Як бачым, авалодванне якуцкай мовай адбывалася праз яе ўжытковае значэнне. Аднак не толькі.

Эдуард Пякарскі даведаўся, што ў 1858 годзе выйшла “Кароткая граматыка якуцкай мовы”, складзеная епіскапам Дзіянісіем (Дзмітрыем Хітровым). Словы ў ёй былі пісаны лацінкай. Гэтая граматыка таксама стала дапаможнікам. Акрамя таго ў рукі трапілі некаторыя іншыя выданні на якуцкай мове, выпушчаныя місіянерскім таварыствам — “Евангелле”, “Дзеянні апосталаў”, “Псалтыр”...

З гэтых кніг ён выпісваў якуцкія словы, каб потым знайсці ім рускія адпаведнікі. Пайшоў насустрач Эдуарду Карлавічу і вядомы рэвалюцыянер П.Аляксееў, які адбываў пакаранне за 18 вёрст ад Э.Пякарскага. Яны пасябравалі і на конях наведваліся адзін да аднаго. П.Аляксееў падарыў Э.Пякарскаму рукапісную кнігу, у якую той рабіў розныя запісы. Пазнаёміўся Эдуард Карлавіч і са святаром з суседняга пасялення Ытык-Кёль Дзімітрыянам Паповым, які таксама працаваў над складаннем слоўніка якуцкай мовы. Д.Папоў пачаў перадаваць яму свае запісы. А да ўсяго ў рукі Э.Пякарскаму трапіў “Якуцка-нямецкі слоўнік”, складзены пецярбургскім вучоным Ота Бёрлінгам.

На складанне слоўніка ў асноўным ахвяраваў зіму, таму што ў іншы час трэба было працаваць па гаспадарцы. Неставала грошай, не хапала самага неабходнага. Пазней прызнаваўся, вяртаючыся ў тыя гады: “Часта не было пісьмовых прылад, даводзілася карыстацца кожнай васьмушкай паперы, у якой адзін бок чысты. Не было свечак і даводзілася чытаць, а калі-нікалі і пісаць, пры святле камінка, рызыкуючы сапсаваць сабе вочы”.

Яшчэ цяжэй стала, калі памёр Д.Папоў. На шчасце, знайшліся новыя памочнікі, а сярод іх найперш ссыльныя, якія, апынуўшыся ў Якуціі, як і Э.Пякарскі, пачалі лічыць яе другой радзімай. Ананій Арлоў, Мікалай Віташэўскі, Марк Натансон ахвотна прапаноўвалі свае пераклады якуцкіх слоў. А ссыльны Усевалад Іёнаў, як высветлілася, сам некалькі гадоў займаўся складаннем руска-якуцкага слоўніка. Свае матэрыялы ён перадаў Эдуарду Карлавічу, а працу па далейшым зборы матэрыялаў працягваў пад яго непасрэдным кіраўніцтвам.

Першы варыянт “Слоўніка якуцкай мовы” змяшчаў сем тысяч слоў. Вестка пра гэтую унікальную працу дайшла ажно ў Парыж. Вядомы мовазнаўца П.Якабі прыслаў Э.Пякарскаму ліст, у якім пытаўся, калі гэты слоўнік убачыць свет і як яго набыць. Адначасова даваў шэраг парад. А Э.Пякарскі пачаў прымаць захады, каб пераправіць рукапіс у сталіцу. З-за валакіты ён апынуўся ва Усходне-Сібірскім аддзеле Геаграфічнага таварыства толькі ў 1890 годзе.

Працуючы над слоўнікам, Эдуард Карлавіч адначасова даследаваў побыт якутаў, іх звычаі, вывучаў матэрыяльную культуру. І ў гэтым кірунку знаходзіў аднадумцаў. Напрыклад, разам са ссыльным Георгіем Асмалоўскім напісаў артыкул “Якуцкі род да і пасля прыходу рускіх”, што быў змешчаны ў “Памятной книжке Якутской губернии” ў 1896 годзе, а напісаны трыма гадамі раней. У згаданым штогодніку былі і іншыя публікацыі Э.Пякарскага.

Нягледзячы на заканчэнне тэрміну ссылкі, пакідаць Якуцію не збіраўся. Пра гэта напісаў у лісце бацьку 2 мая 1894 года: “Раней, чым закончыцца друкаванне слоўніка, мне няма чаго і думаць пра вяртанне на радзіму, хоць нават і будзе атрыманы на тое дазвол, бо нельга кідаць работу, якой аддадзена трынаццаць гадоў лепшай пары жыцця”. У 1894—1896 гадах удзельнічаў у экспедыцыі Усходне-Сібірскага аддзела Рускага геаграфічнага таварыства. У 1898 годзе слоўнік, складзены Эдуардам Карлавічам, выйшаў у Якуцку. У 1900 годзе ён знайшоў памочнікаў і склаў “Кароткі руска-якуцкі слоўнік”, што выдаваўся двойчы. “Нарысы быту арыаянскіх тунгусаў” сталі вынікам удзелу ў 1903 годзе ў рабоце Нелькана-Аянскай экспедыцыі.

З Якуціяй развітаўся толькі тады, калі Акадэмія навук запрасіла для завяршэння працы над слоўнікам. У сталіцу прыбыў 14 верасня 1905 года. Пяць гадоў быў рэгістратарам калекцый у Этнаграфічным аддзеле Рускага музея, а пасля працаваў у Музеі антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра Вялікага пры Акадэміі навук.

Першы выпуск “Слоўніка якуцкай мовы” выйшаў у Пецярбургу ў 1907 годзе. Апошні, трынаццаты, пабачыў свет у 1930-м. 1907 годам пазначаны першы том запісаных Э.Пякарскім “Узораў народнай літаратуры якутаў” (заключны, трэці выдадзены ў 1918 годзе). За першы выпуск слоўніка Эдуард Карлавіч быў удастоены залатога медаля Акадэміі навук, а яшчэ за гэты выпуск і за першы том “Узораў...” атрымаў залаты медаль Рускага геаграфічнага таварыства.

Дзякуючы слоўніку, адкрылася сапраўднае багацце якуцкай мовы. 60.000 слоў! Але гэта не толькі слоўнік пэўнай мовы ў яго традыцыйным разуменні. Э.Пякарскі не проста прыводзіў пэўныя словы ў алфавітным парадку, але і не абыходзіў увагай побыт, звычкі, вераванні якутаў, расказваў пра народныя абрады. Слушна гаворыць В.Грыцкевіч: “За 45 гадоў быў здзейснены подзвіг. Пякарскі стварыў не проста слоўнік якуцкай мовы, а сапраўдную энцыклапедыю ўсяго ўкладу жыцця народа, яго матэрыяльнай культуры”.

А што значыў слоўнік для самога Э.Пякарскага, відаць з артыкула вядомага фальклрыста М.Азадоўскага “Э.К.Пякарскі”, апублікаванага ў часопісе “Советская этнография” адразу пасля смерці вучонага (не стала Эдуарда Карлавіча 29 чэрвеня 1934 года). М.Азадоўскі прыгадвае, як хацеў прыцягнуць Э.Пякарскага да працы над адным калектыўным даследаваннем, але Э.Пякарскі толькі даваў каштоўныя парады, а ад непасрэднага ўдзелу ў рабоце адмовіўся: “Ведаеце, жыць мне засталося няшмат, і я павінен у што б там ні было закончыць ”Слоўнік...”, — я не маю права браць свой час на што-небудзь іншае”.

На жаль, пастаянная занятасць Э.Пякарскага пасля вяртання з ссылкі не дазваляла яму падтрымліваць цесныя сувязі з Беларуссю. Пабываў у ёй толькі ў 1906 годзе. У Пінску пабачыўся з мачахай, братам і сястрой. Яны жылі ў нястачы, таму пахадайнічаў аб уладкаванні брата Восіпа на службу ў акцызнае ведамства. Паездка ж, запланаваная на 1924 год, не адбылася — увесь вольны час забірала праца над слоўнікам: да апошніх дзён працягваў сістэматызаваць матэрыялы, і ў выніку з'явілася дадатковая картатэка на 15 тысяч адзінак.

Куды цяснейшымі былі сувязі з Якуціяй, дзе яго інакш, як Адубар Хаарылабыс (Эдуард Карлавіч), не называлі. А адзін з пачынальнікаў якуцкай літаратуры Аляксей Елісеевіч Кулакоўскі ў 1912 годзе пісаў Э.Пякарскаму: “У нас не было літаратуры, а ваш слоўнік павінен паслужыць падмуркам для яе стварэння... Вы сапраўды заслугоўваеце імя ”бацька якуцкай літаратуры”. Без вас не знайшлося б асобы, у якой хапіла б дзёрзкасці ўзяць на сябе такую каласальную працу, як ваш слоўнік”.

